# СЕКЦИЯ 3
# ПРАВОСЛАВНАЯ ЦЕРКОВЬ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В XX в.

## ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ШЛЮБНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СВЕЦЕ ІМПЕРАТАРСКАГА УКАЗА «АБ УМАЦАВАННІ ПАЧАТКАЎ ВЕРАЦЯРПІМАСЦІ» АД 17. 04. 1905 г.

*В. М. Лянцэвіч*
*(Мінск, Беларусь)*

Паводле ўсеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г., у пяці беларуска-літоўскіх губернях (Мінскай, Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай) вызначаліся дзве асноўныя канфесійныя групы насельніцтва: праваслаўныя (81,4 %) і каталікі (18 %) [1].

Традыцыйна шлюбна-сямейнае права ў Еўропе адносілася да царкоўнай юрысдыкцыі. У праваслаўі такая практыка канчаткова была афармлена яшчэ пры візантыйскім імператары Андроніку Палеалогу не пазней за 1309 г. [2, с. 85]. К пач. XX ст. Руская праваслаўная царква, якая займала ў Расійскай імперыі статус «першынствуючага і пануючага» веравызнання, была цалкам і поўнасцю інтэгравана ў дзяржаўную сістэму, з'яўлялася часткай адміністрацыйнага апарату. Таму на яе ўскладаўся шэраг дзяржаўных функцый, у тым ліку вядзенне прыходскіх (метрычных) кніг, у яіх фіксіраваліся факты нараджэння, заключэння шлюбаў, смерці.

Заканадаўства аб шлюбе і сям'і ў дзяржаве не складала асобнага накірунку. Прызнавалася толькі царкоўная форма шлюбу. Пры гэтым заканадаўча рэгламентаваліся пытанні мінімальнага шлюбнага ўзросту (паводле указа 1830 г., 18 год для мужчыны і 16 – для жанчыны). З 1744 г. дзейнічаў і верхні ўзроставы парог, які складаў 80 год [3, с. 337].

Асаблівасцю рэгламентацыі шлюбна-сямейных сувязяў у Расіі, у параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі, варта адзначыць больш цесную сувязь юрыдычных нормаў з кананічнымі [4, с. 11]. Шлюбныя адносіны ў дзяржаве рэгуляваліся ч. 1 («О правах и обязанностях семейственных») тома Х Звода законаў Расійскай імперыі 1835 г., а таксама шматлікімі царкоўнымі пастановамі. Заключэнне шлюбу павінна было праходзіць у адпаведнасці з правіламі і абрадамі той канфесіі, да якой належалі будучыя муж і жонка.

Справы «цярпімых» рэлігій у шматканфесійнай Расіі рэгуляваліся Уставам духоўных спраў замежных веравызнанняў. Кантраляваў справы Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў Міністэрства унутраных спраў [5, с. 6]. Як і ў праваслаўі, вядзенне метрычных кніг тут адносілася да святарскіх абавязкаў. У другой палове XIX ст. у заканадаўстве з'яўляецца нешта падобнае на еўрапейскі грамадзянскі шлюб, які мае законную сілу без царкоўнага блаславення. Закон ад 19.04.1874 г. рэгламентаваў заключэнне шлюбу паміж «раскольнікамі» (стараверамі), які афармляўся праз запіс у метрычнай кнізе, якую вялі мясцовыя паліцэйскія органы. Да гэтага часу шлюбы старавераў прызнаваліся толькі пры заключэнні іх па праваслаўным абрадзе. Зараз менавіта метрычны запіс, а не рэлігійны абрад, рабіў шлюб законным.

Яшчэ ў 1721 г. Свяшчэнны Сінод дазволіў шлюбы праваслаўных вернікаў з прадстаўнікамі іншых хрысціянскіх канфесій; пры гэтым таінства шлюбу павінна было праводзіцца праваслаўнымі святарамі, і дзеці ад такіх шлюбаў хрысціліся па праваслаўным абрадзе.

Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. [6] прадугледжвала адказнасць за перавод малалетняга як з праваслаўя ў іншую хрысціянскую канфесію (арт. 89, – заключэнне ў крэпасці да 1 года), так і з хрысціянства ў нехрысціянскае веравызнанне (арт. 88, – заключэнне ў крэпасці да 3-х гадоў). Адказнасць была прадугледжана таксама для святароў-неправаслаўных, якія праводзілі шлюбны і іншыя абра-

ды над праваслаўнымі альбо над праваслаўнымі і іншаверцамі, калі раней яны не былі праведзены праваслаўным святаром (арт. 93–94).

Каталіцкая царква лічыла змешаныя шлюбы, праведзеныя некаталіцкімі святарамі, несапраўднымі, а паколькі пераход з праваслаўя быў забаронены і заканадаўства не прадугледжвала ніякай законнай магчымасці змены праваслаўнай веры [7, с. 148], то касцёл забараняў нават кантакты каталіцкай моладзі з праваслаўнымі.

На пачатку XX ст. у Заходняй Еўропе назіраецца тэндэнцыя да аддзялення царквы ад дзяржавы. Гэта стала своеасаблівым паваротам дзяржаўна-царкоўных адносін у Расійскай імперыі. 12.12.1904 г. з'яўляецца Імянны Высачайшы Указ «О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка», які прадугледжваў прынянце ў адміністрацыйным парадку мер да ліквідацыі ўсіх абмежаванняў рэлігійнага жыцця неправаслаўных вернікаў [8, с. 74–75].

Імператарскі указ «Об укреплении начал веротерпимости» і адпаведнае яму палажэнне Камітэта Міністраў выходзіць 17.04.1905 г. [9]. Галоўным зместам дакумента стала мажлівасць расійскімі падданымі самастойнага выбару сваёй канфесійнай прыналежнасці. Пры гэтым праваслаўная царква не страціла пануючай ролі ў дзяржаве. Аднак указ насіў агульны характар, не ўтрымліваў нарматыўнай працэдуры пераходу і нават указання на тое, што падобная працэдура будзе распрацавана [10, с. 80].

Галоўным вынікам прыняцця Указа сталі масавыя пераходы з праваслаўя ў іншыя, пераважна хрысціянскія канфесіі. Па дадзеных МУС, па ўсёй імперыі з 17.04.1905 да 01.01.1909 г. толькі ў каталіцызм перайшло 233 тыс. чал.; 10 тыс. праваслаўных сталі пратэстантамі. Адзначыліся пераходы ў стараверства і сектанцтва. Усяго па беларуска-літоўскіх губернях з праваслаўя ў каталіцызм з 1905 па 1907 гг. перайшло 49 425 чал. [8, с. 190]. В. Яноўская і А. Бендзін бачаць адной з важнейшых перадумоваў падобных пераходаў змешаныя шлюбы [8, с. 109–110; 11, с. 275–277].

21.04.1905 г. з'яўляеца цыркуляр віленскага біскупа Эдуарда фон Роппа, у якім утрымліваецца парадак пераходу з праваслаўя ў каталіцызм. Законным каталіцкі касцёл лічыў толькі шлюбы паміж каталікамі. Змешаныя праваслаўна-каталіцкія шлюбы станавіліся сапраўднымі толькі пасля пераходу праваслаўнага боку ў каталіцызм. Для гэтага жадаючы павярнуцца да каталіцызму павінен быў звярнуцца да епіскапа альбо ў кансісторыю, дзе паведамляў сваё імя, прозвішча, сацыяльны і сямейны стан, свой праваслаўны прыход і каталіцкі, да якога жадаў прыпісацца. Пасля гэтага зноўдалучаны ўключаўся ў парафіяльныя спісы названага касцёла [11, с. 223].

Толькі 18.08.1905 г. з'яўляецца цыркуляр МУС № 4628, які рэгламентуе даволі складаную працэдуру пераходу з праваслаўя, пры якой кожны праваслаўны павінен быў звярнуцца з адпаведным прашэннем непасрэдна да губернатара, а таксама прайсці праз працэдуру «перакананні» з боку праваслаўнага святара, якая доўжылася на працягу месяца [10, с. 81]. Пры гэтым улады павінны былі ўпэўніцца ў грамадзянскай праваздольнасці і добраахвотнасці пераходу.

Што тычыцца змешаных шлюбаў, то ні Указ ад 17.04.1905 г., ні царскі Маніфест 17.10.1905 г., у якім былі абвешчаны «Асновы грамадзянскай свабоды», і прадстаўлялася ў тым ліку свабода сумлення, не ўносіў змены ў працэдуру іх рэгістрацыі. Захоўвалася абавязковасць праваслаўнага абраду і хрышчэння дзяцей у праваслаўную веру. У выпадку, калі праваслаўны пераходзіў у каталіцтва, то і дзеці да 14 гадоў маглі быць пераведзены ўслед за ім [12, с. 114]. Калі ж у іншае веравызнанне пераходзіў толькі адзін з бацькоў, непаўналетнія дзеці заставаліся ў старой веры. Пры пераходзе абодвух бацькоў дзеці да 14-ці год пераходзілі з бацькамі, а старэйшыя заставаліся ў былой веры [8, с. 109].

В. Яноўская адзначае пэўную асаблівасць: у беларуска-літоўскіх і заходнеўкраінскіх губернях пры заключэнні шлюбу паміж прадстаўнікамі розных хрысціянскіх канфесій абрад праводзіўся па

веравызнанні нявесты; і толькі пры адмове святара вянчанне мог правесці святар канфесіі жаніха [8, с. 81].

У снежні 1905 г. на падставе цыркуляра № 4628 Свяшчэнны Сінод выдае Указ «О порядке перехода православных лиц в инославные и иноверные исповедания». Увогуле за перыяд першай расейскай рэвалюцыі было прынята каля 24 нарматыўных актаў па рэлігійным пытанні [13], што сведчыла аб важкасці дадзенай праблемы ў дзяржаве.

Каталіцкія святары ўцэлым ігнаравалі нормы цыркуляра № 4628 і працягвалі ажыццяўляць пераходы. Нормы ўрадавай пастановы ад 14.03.1906 г. прадугледжвалі крымінальную адказнасць для іншаслаўнага духавенства за правядзенне царкоўных абрадаў над праваслаўнымі [10, с. 81].

Пры гэтым ніводны прававы дакумент не разглядаў шэраг пытанняў рэгулявання шлюбных адносін. Судовая практыка сведчыць аб заканатворчых недахопах. У суды звярталіся з запытамі: ці магчымы перавод у іншую веру дзяцей пры пераходзе аднаго з бацькоў, калі другі памёр; ці ёсць магчымасць перавесці ў нехрысціянскае веравызнанне дзяцей да 14-ці гадоў, калі да яго вяртаюцца абодва бацькі. Як правіла, суды пакідалі падобныя звароты без адказу альбо давалі адмоўны адказ.

31.12.1907 г. атрымалі ўхваленне часовыя правілы МУС, якія ўзаконьвалі шлюбы, выкананыя па іншаслаўных і іншаверных абрадах асобамі, што адыйшлі ад праваслаўя да ўказа ад 17.04.1905 г., а таксама народжаных ад іх дзяцей, калі пры іх заключэнні выконваліся патрабаванні грамадзянскага закону і кананічныя правілы, а таксама быў зроблены запіс у прыходскай кнізе [12, с. 115].

Пасля прыняцця Указа аб верацярпімасці, такім чынам, рэлігійны мір на беларускіх землях не наступіў і градус канфесійнай напружанасці нават вырас. Гэта было звязана перш за ўсё з недакладным прававым рэгуляваннем пытання пераходаў з праваслаўя.

Архіўныя дадзеныя, прыведзеныя ў артыкулах М. Караля і М. Крывіцкага [7; 10, с. 84–86], сведчаць аб шматлікіх выпадках прымусу пры пераходзе з праваслаўя ў каталіцызм і шэрагу судовых разбіральніцтваў, звязаных з неправамерным вызначэннем бацькамі неправаслаўнага хрышчэння для сваіх дзяцей у змешаных шлюбах. Часткова гэтае пытанне было ўрэгулявана законапраектам П. Сталыпіна (люты 1907 г.), паводле якога веравызнанне дзяцей рэгулявалася пагадненнем бацькоў; але той так і не быў ухвалены II, а потым і III Думай.

## Літаратура і крыніцы

1. Общий свод по империи результатов данных первой всеобщей переписи населения, произведенной 28 янв. 1897 г. /Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Паровая тип. – Лит. Н. Л. Ныркина, 1905. – Т. 1. – С. 252 – 253.

2. Любич, А. А. Правовые аспекты института церковного брака / А. А. Любич // Свято-Михайловские чтения «Православие и современность» 10-20 нояб. 2005 г. Доклады и тезисы. – Братство в честь святого архистратига Михаила в г. Минске, 2005. – С. 83 – 91.

3. Суворов, Н. С. Учебник церковного права / Н.С. Суворов. – М.: Изд-во Зерцало, 2004. – 407 с.

4. Сатолин, В. Н. История становления и развития законодательства о браке и семье Беларуси: автореф. дисс. …канд. юр. наук: 12.00.01 /В. Н. Сатолин; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1997. – 20 с.

5. Одинцов, М. И. Государство и церковь в России: XX век / М. И. Одинцов. – М.: «Луч», 1994. – 171 с.

6. Уголовное уложение 1903 г. // Николин, А. Церковь и государство (история правовых отношений). Приложение XVIII. – М.: Издание Сретенского монастыря, 1997. – С. 359 – 364.

7. Кароль, М. М. «Цяпер дадзена свабода ад Гасудара і кожны свабодную можа вызнаваць веру»: паўсядзённыя практыкі

міжканфесійных канверсій пасля прыняцця Указа ад 17 красавіка 1905 г.: (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / М. М. Кароль // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Сер.: Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства / Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2018. – Вып. 16. – С. 148 – 158.

8. Яноўская, В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863 – 1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.

9. Именной высочайший Указ, данный Сенату (апреля, 17, 1905 г.) Об укреплении начал веротерпимости / Приложение XVI; Высочайше утвержденное положение Комитета Министров (Апрель, 17, 1905 г.) Об укреплении начал веротерпимости. Приложение XVII // Николин, А. Церковь и государство (история правовых отношений). – С. 351 – 359.

10. Кривицкий, М. А. Предпосылки масовых переходов из православия в католичество на территории Беларуси после издания указа о веротерпимости (1905–1914) / М. А. Кривицкий // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. Сер.: Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства / Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2013. – Вып. 11. – С. 76–92.

11. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. – Минск: БГУ, 2010. – 439 с.

12. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор’ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава; Навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.

13. Теплова, В. А. Православная церковь Беларуси конец XV – начало XX в / В. А. Теплова. – Режим доступа: http://sobor.by/bcerk.htm. – Дата доступа: 09.10.2019.